**Стрыжонак І.М.,** *ст.выкладчык*

# ШЛЯХІ РЭАРГАНІЗАЦЫІ СЕТКІ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ

Адным з галоўных аб'ектаў даследавання бібліятэчных рэсурсаў з'яўляюцца пабудова і размяшчэнне бібліятэчнай сеткі, бо яе стан непасрэдна ўплывае на арганізацыю бібліятэчнага абслугоўвання ў кожным рэгіёне. Значную частку сістэмы бібліятэк рэспублікі складаюць бібліятэкі Міністэрства культуры. Колькасць іх, згодна са зводкай гадавых справаздач у 1995 г., - 4882, іх фонд склаў 735044 тыс. экз.; імі карысталіся 3970,6 тыс. чытачоў (38% насельніцтва). Сацыяльна-эканамічныя змены ў грамадстве ўплываюць і на стан перабудовы бібліятэчнай справы, патрабуючы рэарганізацыі бібліятэчнай сістэмы як структурнай, так і відавой.

Крызісная сітуацыя ў арганізацыі сістэмы бібліятэк праяўляецца ў існаванні адпаведных разыходжанняў паміж нарматыўным і рэальным узроўнем развіцця бібліятэчных сетак, у нераўнамерным размяшчэнні бібліятэк, адставанні іх ад змен, якія адбываюцца ў адміністрацыйных раёнах гарадоў (напрыклад, у сувязі з будаўніцтвам жылля). Працягвае скарачацца сетка бібліятэк у сельскай мясцовасці (у Мінскай вобласці іх колькасць у 1991-1995 гг. скарацілася на 103 адзінкі). Некаторыя бібліятэкі ў невялікіх населеных пунктах закрываліся зусім, іншыя рэарганізоўваліся ў бібліятэчныя пункты. І як вынік - памяншэнне колькасці чытачоў у сельскіх бібліятэках у 1995 г. на 64,2 тыс. (у параўнанні з 1994г.). А наогул у дзяржаўных бібліятэках рэспублікі колькасць чытачоў зменшылася на 15,7 тыс. (на 1995 г.).

Зараз назіраюцца не толькі скарачэнне сеткі бібліятэк, асабліва ў сельскай мясцовасці, але і рэарганізацыя дзяржаўных публічных бібліятэк. Адбылося аб'яднанне універсальных навуковых абласных бібліятэк з абласнымі дзіцячымі бібліятэкамі; у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маланаселеных пунктах масавыя бібліятэкі аб'ядноўваюцца з клубамі ў адзіную ўстанову - бібліятэку-клуб (або клуб-бібліятэку), якая спалучае арганізацыю абслугоўвання насельніцтва з арганізацыяй яго адпачынку. Станоўча скончыўся эксперымент 1992-1995 гг. па аб'яднанні сельскіх і школьных бібліятэк. Сёння гэтыя ўстановы застаюцца агульнадаступнымі для насельніцтва і адначасова забяспечваюць навучальны працэс. Дзейнічаюць у рэспубліцы бібліятэкі сямейнага чытання, бібліятэкі-музеі, бізнес-бібліятэкі, маладзёжныя цэнтры і інш. У перспектыве стварэнне медыятэк, віртуальных бібліятэк.

Сёння складана вызначыць эфектыў-насць усіх гэтых бібліятэчных устаноў, але ўжо зараз зразумела, што яны ствараюць умовы для павышэння ролі бібліятэк, больш поўна ўлічваюць патрэбы насельніцтва сваіх рэгіёнаў і лепш выкарыстоўваюць свае фонды. Тэрытарыяльная палітыка развіцця сеткі дзяржаўных бібліятэк зводзіцца, галоўным чынам, да павелічэння колькасці публічных бібліятэк у раёнах новабудоўляў. Пытанні матэрыяльна-тэхнічнай базы, рэсурснага забеспячэння вырашаюцца слаба, не ўлічваюцца і спецыфіка адміністрацыйнага раёна, развіццё сацыякультурнай сферы. Пры рэарганізацыі неабходна мець на ўвазе, што пры набудове новых і рэканструкцыі старых памяшканняў трэба арыентавацца на новую тэхналогію, пашырэнне інфармацыйнай дзейнасці, развіццё нетрадыцыйных паслуг, трэба прадугледзець існаванне розных па функцыянальнай накіраванасці публічных бібліятэк, якія павінны дзейнічаць у залежнасці ад умоў і рэальных запытаў насельніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ